Тэст
“Методыка навучання пунктуацыі”

**1. Раздзяліце знакі прыпынку паводле іх функцыі на раздзяляльныя і выдзяляльныя**:
а) двукоссе;
б) коска;
в) працяжнік;
г) пытальнік;
д) клічнік;
е) шматкроп’е;
ё) кропка з коскай;
ж) дужкі;
з) кропка;
і) двукроп’е.
**2. Вызначце, паводле чаго знакі прыпынку падзяляюцца на наступныя групы:**
а) кропкавыя (кропка, коска, двукроп’е, кропка з коскай), пункцірна-лінейныя (шматкроп’е), фігурныя (пытальнік, клічнік, дужкі, двукоссе);
б) раздзяляльныя і выдзяляльныя;
в) граматычныя, сэнсавыя і інтанацыйныя;
г) вышэйшага і ніжэйшага ўзроўняў.
**3. Вызначце знакі прыпынку вышэйшага і ніжэйшага ўзроўняў у залежнасці ад іх месца і ролі ў тэксце**:
а) кропка, клічнік, пытальнік, шматкроп’е ў канцы сказа;
б) коска, працяжнік, двукроп’е, кропка з коскай у канцы простых сказаў у межах складанага;
в) коска, працяжнік, кропка з коскай, шматкроп’е ў межах простага сказа;
г) працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам;
д) дужкі, працяжнікі, коскі ў межах простага сказа.
**4. Якое паходжанне мае тэрмін “пунктуацыя”?**
**5. Дайце сучасныя аналагі старажытным назвам знакаў прыпынку**:
а) закавыка, б) чужаслоў, в) недаказ, г) подстолія, д) съединителная.
**6. Назавіце этапы вывучэння пунктуацыі ў школе.**
**7. Назавіце агульнадыдактычныя і прыватнаметадычныя прынцыпы навучання пунктуацыі**.
**8. Назавіце групы практыкаванняў па пунктуацыі**.
**9. Вызначце тыпы пунктуацыйных памылак**.